УДК 271.2(476)

# ТУРАЎСКАЯ ЕПАРХІЯ І ПАШЫРЭННЕ ХРЫСЦІЯНСТВА НА ПАЎДНЁВЫХ ЗЕМЛЯХ БЕЛАРУСІ

***Я. Р. Самуйлік***
*кандыдат філалагічных навук, дацэнт*
***К. Л. Саламянка***
*студэнтка будаўнічага факультэта*
*Беларусь, Брэст, БрДТУ*

*Артыкул прысвечаны асноўным падзеям у гісторыі Тураўскай епархіі ў XI–XII стст. і ўплыву гэтай епархіі на хрысціянізацыю паўднёвых земляў Беларусі.*
*Ключавыя словы: рэлігія, хрысціянства, Тураў, Тураўская епархія, паўднёвая Беларусь.*

Да канца X ст. жыхары беларускіх земляў заставаліся язычнікамі. У славян існавалі ўяўленні аб багах, якія ўвасаблялі розныя з’явы прыроды: Сварог – бог неба; Ярыла, Дажбог, Вялес – сонечныя богі; Перун – бог грому і маланкі.

Важным момантам у гісторыі Беларусі стала прыняцце хрысціянства. Гэта падзея звязана з кіеўскім князем Уладзімірам, які ў 988 годзе прыняў хрышчэнне сам і ахрысціў падуладныя яму землі. Пасля князь разаслаў сваіх сыноў па гарадах, у тым ліку Святаполка ў Тураў. Ужо ў 1005 годзе была створана Тураўская епархія, якая стала асноўным цэнтрам распаўсюджвання новай веры на паўднёвых землях Беларусі.

Тураўская епархія з’яўляецца другой па старажытнасці сярод праваслаўных епархій у Беларусі. Тураўскія епіскапы прызначаліся на кафедру Кіеўскімі мітрапалітамі. У сінодзіку Варварынскага манастыра, які ў XIX ст. знаходзіўся ў Старажоўскай царкве, напісаны імёны 23-х архірэяў, якія займалі Тураўскую кафедру на працягу XII–XVI стст. [1].

Аб адкрыцці епархіі паведамляецца ў статутнай грамаце, якая змяшчаецца ў Кіеўскім пацерыку рэдакцыі архімандрыта Іосіфа (Трызны) пад назвай “Аб стварэнні Тураўскай епіскапіі”. Калі верыць яе допісу, першым архірэем, які заняў Тураўскую кафедру, быў епіскап Фама, звестак аб якім у летапіснай традыцыі не захавалася. Сярод гарадоў, якія першапачаткова ўваходзілі ў межы Тураўскай епархіі, называюцца: Пінск, Навагародак, Гродна, Слонім, Брэст, Ваўкавыск, Здзітаў, Слуцк, Капыль і некаторыя іншыя [2, с. 16].

Святаполк Уладзіміравіч, нязгодны з рэлігійнай палітыкай бацькі, вымушаны быў лічыцца з настроямі сваёй дружыны і тураўскай знаці, якія насцярожана ўспрымалі любыя пачынанні Кіева, стаў патураць заходняму хрысціянству (у тыя часы хрысціянства яшчэ фармальна заставалася адзіным). Ён жаніўся на каталічцы, наблізіў да сябе калабжэгскага епіскапа Рэйнберна – вядомага барацьбіта з язычніцтвам на тэрыторыі Польшчы і аддаў перавагу каталіцтву, збіраючыся ўвесці менавіта гэтую веру ў сваім княстве з дапамогай Рэйнберна. Існуе меркаванне, што Рэйнберн быў першым тураўскім епіскапам. У нейкай ступені з-за веры паміж Святаполкам і яго бацькам Уладзімірам Хрысціцелем адбылася сварка, у выніку якой тураўскі князь, яго жонка і Рэйнберн былі пасаджаны ў турму. Апошні там і памёр [3, с. 164].

Станаўленне хрысціянства ў Тураве суправаджалася сутыкненнямі першых хрысціян і язычнікаў. Мясцовае паданне расказвае пра каменныя крыжы, якія прыплылі да Турава па Прыпяці і афарбавалі яе воды каля горада ў колер крыві. У сувязі з гэтым прыгадваецца імя пакутніка Дзіянісія, які прапаведваў тут пасля Тура і быў забіты язычнікамі з суседняга паселішча, названымі міхнаўцамі – жыхарамі вёскі Міхнавічы (цяпер у Калінкавіцкім раёне) [2, с.17].

Помнікам ранняга прыняцця хрысціянства ў Тураве з’яўляецца часткова ацалелае Тураўскае евангелле XI ст. (10 лістоў), знойдзенае ў 1865 годзе. Гэта – найстаражытнейшы рукапіс з знойдзеных у Беларусі. Яшчэ крыху і рукапіс мог беззваротна адысці ў нябыт, але цудам быў заўважаны мастаком Васілём Гразновым пры наведванні ім Праабражэнскай царквы Турава ў 1865 годзе.

Наступная пасля 1005 года згадка аб Тураўскай епархіі сустракаецца ў “Слове пра Марціна мніха Тураўскага” (помнік канца XII ст.). У ім называюцца імёны двух Тураўскіх уладароў Сімяона і Ігната, якія займалі кафедру ў Тураве ў першай палове XII ст. У 1146 годзе, паводле Іпацьеўскага летапісу, тураўскім епіскапам стаў Іаакім, які ў наступным 1147 годзе прыняў удзел у абранні на Кіеўскую мітраполію знакамітага Клімента Смаляціча [2, с. 17].

Па меры зацвярджэння хрысціянства ў Полацкай і Тураўскай землях узводзіліся праваслаўныя храмы, якія станавіліся цэнтрамі царкоўнага жыцця ўсходніх славян. У той час многія храмы на Тураўскай зямлі прысвячаліся Божай Маці. Большасць з іх называліся ў гонар Яе Раства. У Тураве на замчышчы археолагі адкрылі падмурак каменнага храма XII ст. У той час на тэрыторыі Беларусі гэты храм па сваіх памерах саступаў толькі Сафіі Полацкай. Многія храмы тых гадоў былі ўпрыгожаны фрэскамі, мазаікамі, іконамі [4].

Да 1182 года адносіцца здабыццё Купяціцкай іконы Божай Маці пад Пінскам (у той час горад уваходзіў у склад Тураўскай епархіі). Ікона з’яўляецца найстаражытнейшым цудатворным абразом Беларусі. Крыжападобны па сваёй форме гэты абраз мае ў цэнтры, замест распяцця, выяву Божай Маці з немаўлём Ісусам Хрыстом і ўяўляе сабой бронзавы крыж-энкалпіён XII ст. [2, с. 28].

Адмысловае значэнне ў царкоўнай гісторыі Беларусі мела XII ст. Па дадзеных археалогіі, на працягу XII ст. ва ўсходнеславянскага насельніцтва Тураўскай зямлі на змену абраду крэмацыі (трупаспалення) прыйшоў абрад інгумацыі (трупапалажэння), што, на думку большасці археолагаў, сведчыць аб дастаткова шырокім распаўсюджванні тут хрысціянства [2, с. 21].

У XII ст. на Тураўскіх землях, як і ў іншых абласцях Кіеўскай Русі, хутка зацвердзілася шанаванне святых пакутнікаў Барыса і Глеба. У той час у Тураве быў заснаваны манастыр у іх гонар [4].

У XII ст. на Тураўскіх землях жылі святыя, пазней кананізаваныя Рускай Праваслаўнай Царквой. Сярод іх найбольш вядома імя свяціцеля Кірылы, епіскапа Тураўскага. Свяціцель Кірыл валодаў рэдкім літаратурным дарам. Ім было напісана восем урачыстых “Слоў”, прысвечаных праслаўленню двунадзясятых свят і нядзельных дзён Пасхальнага цыкла; “Прытча аб душы і целе”, “Аповесць аб беларызцы і аб мнішчы”, “Паданне аб чарнарызскім чыне”, трыццаць малітваў, два каноны і шэраг іншых твораў. Яго творы былі вядомы ў Тураўскай зямлі і за яе межамі. Разам з творамі візантыйскіх прапаведнікаў яны ўключаліся ў склад розных зборнікаў (у тым ліку Урачысніка). Не выпадкова

празвалі свяціцеля Кірыла “Златавустам, лепш за другіх заззяўшым на Русі” [3, с. 184].

Сучаснікамі свяціцеля Кірылы з’яўляліся прападобны Марцін, пустэльнік Тураўскі, і свяціцель Лаўрэнцій, які ў 1184 годзе змяніў на Тураўскай кафедры свяціцеля Кірыла [4].

Сцвярджэнню хрысціянскай веры на Тураўскіх землях нямала спрыялі прадстаўнікі кіруючага класа мясцовага грамадства. Як пісаў прафесар А. В. Карташаў: “Крыніцы вельмі мала паведамляюць нам звестак аб характары рэлігійнасці простага народа, але дастаткова гавораць пра князёў і ўвогуле пра арыстакратычную меншасць, найбольш асвечаную і найбольш трывала “хрысціянізаваную”.

У XII ст. жонка Святаполка Ізяславіча, Варвара заснавала ў Тураве першы жаночы манастыр у гонар святой велікамучаніцы Варвары [2, с. 30].

У пачатку XI ст. Тураў меў вялікае значэнне і з’яўляўся палітычным, эканамічным і культурным цэнтрам Тураўскага княства. Гэты высокі статус абумовіў стварэнне ў горадзе епіскапскай кафедры. Тураўская епархія адыграла важную ролю ў хрысціянізацыі паўднёвых земляў Беларусі. Пра вынікі, якія прынесла яе адкрыццё, гаворыць той факт, што ў 1241 годзе ў Тураве налічвалася каля 50 цэркваў і манастыроў [1]. Хрысціянства надало магутны імпульс культурнаму развіццю паўднёвай Беларусі. Яно садзейнічала стварэнню многіх выдатных помнікаў архітэктуры і жывапісу, распаўсюджванню пісьменства, развіццю летапісання і ўстанаўленню больш цесных міжнародных сувязяў з хрысціянскімі дзяржавамі.

**Спіс крыніц і літаратуры:**

1. История Туровской епархии [Электронный ресурс] // Туровская епархия. – Режим доступа : http://www.turov.by/eparchia/history. – Дата доступа : 30.10.2022.

2. Кривонос, Ф. Лекции по истории Православной Церкви Беларуси / Ф. Кривонос. – Минск : Врата, 2012. – 240 с.

3. Гісторыя Беларусі: у 2 ч. / І. П. Крэнь [і інш.]. – Мінск : РІВШ БДУ, 2000. – Ч. 1 : Са старажытных часоў да канца XVIII ст. : Курс лекцый. – 656 с.

4. Распаўсюджванне хрысціянства і ўтварэнне першых епархій [Электронны рэсурс] // Афіцыйны партал Беларускай Праваслаўнай царквы. – Рэжым доступу : http://church.by/by/belorusskiy-ekzarhat/rasprostranenie-hristianstva-i-uchrezhdenie-pervyeparhij?ysclid=lajd4keigp496989226. – Дата доступу : 30.10.2022.